Несур'ёзна пра сур'ёзнае

## Мікола Чарняўскі

# Гарэм на балконе

Сатыра
Гумар

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2017

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
Ч-21

*Серыя заснавана ў 2014 годзе*

Рэдакцыйны савет:
*М. В. Шабовіч, А. М. Зэкаў, К. В. Камейша,*
*Л. Ф. Анцух, В. А. Губараў, А. В. Кубышкіна*

**Чарняўскі, М. М.**
Ч-21 Гарэм на балконе : сатыра, гумар / Мікола Чарняўскі. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2017. — 144 с. : іл. — (Несур'ёзна пра сур'ёзнае).
ISBN 978-985-581-029-3.

Калі вам часам засумуецца, агорне маркота — разгарніце кнігу «Гарэм на балконе» і памылкі не зробіце. У новым зборніку сатыры і гумару Міколы Чарняўскага — усё толькі сапраўды вясёлае, дасціпнае, з гуллівай усмешкай. Паэт запрашае пажартаваць з ім: дзе горка і колка, дзе ў добрым настроі, ад душы.

«Хто часцей смяецца, той даўжэй жыве...» Гэты «рэцэпт» аўтара з усёй сур'ёзнасцю падмацаваны і сатырычнай часткай кнігі, дзе сабраны вершы «Нукайла», «Дэмагог», «Шпунт», «Сенькава шапка», «Валюта душы», «Разборкі», «Бі свайго...» ды інш.

Выданне адрасуецца шырокаму колу чытачоў.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-581-029-3**
© Чарняўскі М. М., 2017
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва "Чатыры чвэрці"», 2017

# Быў хаўрус, альбо камар на матацыкле



# Танцы ў інтэрнаце

Я на ўваходзе правяраю пропускі.
Дзяжурны я —
Павінен тут стаяць.
Аднекуль хлопец прыблукаў,
Стаіць і просіцца:
— Пусці, браток,
Пусці хвілін на пяць!..

— Без пропускаў
дзяўчат пускаем толькі, —
Яму ў адказ
Прамовіў нехта з нас…
А ў вестыбюлі плаўна з-пад іголкі
Ліецца лёгкі і празрысты вальс…

— Ты да каго ідзеш?
— Іду да дзеўчыны…
Не бойся, я цябе не падвяду.
Пусці, будзь другам, а?..
Сказаць мне нечага,
Гляджу ў падлогу, быццам у ваду.

Прыкмеціў:
Позірк у мой бок скіраваны
І поўны смутку шчыры той пагляд.
Дзяўчына ў туфельках лакіраваных
Нарэшце падыходзіць…
Мне назад

Прыйшлося адступіцца да парога,
А позірк дзеўчыны,
Здаецца, дакараў:
«Эх, пэўна, не кахаў яшчэ нікога!
Навошта чалавека затрымаў?»

А хлопец заіскрыўся гэтым мігам,
Скубнуў я за рукаў яго крадком
І ціхенька яму прамовіў:
— Шмыгай!
Але глядзі, не ўбачыў каб студком!..

Чуваць, як чокаюць абцасы,
Нібы ходзікі,
І танга плаўнае кранае слых.
Прашу вас, хлопцы,
Не стаўляйце на ўваходзе больш —
«Чужых» на танцы прапушчу
Усіх.

## Замачылі

Купіў шнуркі Пятро,
Звычайныя шнуркі,
Хто рваў іх часам —
Клопат зразумее.
І толькі з крамы выйшаў —
Дружбакі
Сцяною абступілі…
— Ёсць ідэя! —
Тут хтосьці раптам выгукнуў
З сяброў.
— Па звычаі,
Што ў нас здаўна вядзецца,
Іх замачыць
Не шкодзіла б, Пятро,
Тады ніводзін, шэльма,
Не парвецца!..

— Куды ж кірунак возьмем?
— Хіба ў парк,
Прысядзем там дзе-небудзь
У зацішку
І пад уздыхі закаханых пар
За доўгае жыццё шнуркоў
Пацягнем крышку…

Пад ліпаю,
Разгалістай, густой,
Прызнацца, разам

Больш я іх не бачыў.
Пятра ж заўважыў
Раніцаю той
Я ў парку аднаго:
На лаўцы спячым.

З-пад левае
Намуленай шчакі
Завялаю, прымятаю травінкай
Спадалі долу новыя шнуркі,
А сам Пятро —
Ляжаў без чаравікаў.

# Камар на матацыкле

Да розных з’яў прывыклі,
Такога ж не было:
Камар на матацыкле
Праступе праз сяло.
Ляціць у цёмны вечар,
Распырскваючы гразь.
Пішчыць камар:
— Знявечу!!!
Пад колы не падлазь!

На зуху — шлем глыбокі
І куртка «Адзідас».
— Я не камар-р-р,
Я — р-рокер-р-р! —
Хрыпіць, хоць позні час.
Трашчыць матор, страляе,
Віскочуць тармазы…
Не спіць ніхто — гуляе
Камар: зум-зы, зум-зы!

І — уляцеў у пастку,
Як гнаў, бы на пажар.
Лясь!
Драндулет — на часткі,
А сам камар —
Да хмар!
Крыло зламаў з наскоку
І нос — адно прысніць…

Прыслухайцеся ў змроку:
Ці то не ён, той «рокер»,
Так жаласна звініць?

# Быў хаўрус...

Прыгадаю часам ноччу:
Быў хаўрус, адна сям'я.
Сёння —
Кум «налева» збочваў,
А назаўтра збочваў —
Я.
Так мы чаргаваліся,
Так мы харчаваліся.

Быў «прывоз» малы й вялікі.
Звычка ў нас была свая:
Сёння —
Кум на чарку клікаў,
А назаўтра клікаў —
Я.
Так мы чаргаваліся,
Так мы чаркаваліся.

Хоць начальства аўтабазы
Нас любіла паўшчуваць, —
Не падумалі ні разу
Мы з хаўрусам парываць.
Ды бяда ўчынілася,
Ды бяда звалілася.

Кум пад чаркай «пасваволіў» —
Сеў за руль...
Падбіў дваіх...



# Пра аўтара

Мікола Чарняўскі нарадзіўся 16 студзеня 1943 года ў вёсцы Буда-Люшаўская Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці.

Скончыў Беліцкую СШ Рагачоўскага раёна, а ў 1966 годзе — вячэрняе аддзяленне філфака БДУ імя У. І. Леніна. Адначасова з вучобай ва ўніверсітэце працаваў у рэдакцыі газеты "Піянер Беларусі", рэдактарам замежнага вяшчання Беларускага радыё. З 1966 па 2007 гг. — у рэдакцыях часопісаў "Бярозка" і "Вясёлка".

Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, Граматай Вярхоўнага Савета БССР. Выдатнік народнай асветы. Выдатнік друку Беларусі.

Першы верш "Васілёк" надрукаваны ў 1958 г. у газеце "Піянер Беларусі". Аўтар зборнікаў лірыкі "Чалавечнасць" (1971), "Трывога" (1988), "На плошчы памяці маёй" (2014); сатыры і гумару "Казёл-моднік" (1978), "І не косяць, і не жнуць..." (1982), "Камар на матацыкле" (1985), "Нашто бабе агарод?" (1989), "Лёкса ў люксе" (1993), "У трох соснах..." (1996), "Прызба, альбо Смяяцца — не плакаць" (2012); шматлікіх кніг вершаў і прозы для дзяцей. Чатыры разы станавіўся лаўрэатам рэспубліканскіх конкурсаў на лепшы твор для дзяцей і юнацтва. Асобнымі кніжкамі выдаваўся ў Расіі і Польшчы.

Некаторыя творы перакладзены таксама на ўкраінскую, малдаўскую, літоўскую, кіргізскую,

туркменскую, грузінскую, чувашскую, башкірскую мовы. Пераклаў на беларускую мову творы многіх паэтаў і празаікаў далёкага і блізкага замежжа. З'яўляецца аўтарам шэрагу тэкстаў песень і кантат. Сабраная і апрацаваная ім, выйшла кніга "Казкі дзяцей Беларусі" (2002).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Маўра (1995) за зборнік вершаў і казак "Каго баіцца зубр?", прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2001) за кнігу "Хто пакрыўдзіў кракадзіла?", прэміі імя Васіля Віткі часопіса "Вясёлка" (2002), літаратурнай прэміі "Залаты Купідон" (2010) за кнігу вершаў і казак "Сонечны кошык".

Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Адзначаны медалём "За вялікі ўклад у літаратуру". Ганаровы грамадзянін Буда-Кашалёўскага раёна. Жыве ў Мінску.

# ЗМЕСТ

## БЫЎ ХАЎРУС, альбо КАМАР НА МАТАЦЫКЛЕ

Танцы ў інтэрнаце . . . . . 4
Замачылі . . . . . 6
Камар на матацыкле . . . . . 8
Быў хаўрус… . . . . . 10
Клапатлівая цешча . . . . . 12
А я не сплю… . . . . . 13
Пераборлівы Лявон . . . . . 15
Трэніроўка . . . . . 17
Апошні білет . . . . . 19
Ішла дзеўка да вады… . . . . . 21
Ой, «Жыгулі»!.. . . . . . 23
Лякарства . . . . . 25
Піла . . . . . 27
Курортнікі (*З Паўла Глазавога*) . . . . . 29
Падласы . . . . . 30
Модніца . . . . . 32
Нясуха . . . . . 34
Трывога . . . . . 36
Кумава катанне (*З Пятра Рабра*) . . . . . 37
Дзяльба . . . . . 39
Пляшнікі . . . . . 41
Пляткаркі (*З Алеся Жалдака*) . . . . . 43
Новая пара — дзед і Тамара (*З Міколы Дзмітрыева*) . . . . . 45
Няўдача . . . . . 47

## НАМЕНКЛАТУРНЫ ШПУНТ, альбо НАШТО БАБЕ АГАРОД


Нукайла . . . . . . . . . . 50
Дэмагог . . . . . . . . . . 52
Шпунт . . . . . . . . . . 54
Сенькава шапка . . . . . . . . . . 56
Штукар . . . . . . . . . . 58
Недавер . . . . . . . . . . 60
Блінны кароль . . . . . . . . . . 62
Нашто бабе агарод… . . . . . . . . . . 65
Пестуны . . . . . . . . . . 67
Крывая… матэматыка . . . . . . . . . . 69
Дуля з макам . . . . . . . . . . 70
Карыта . . . . . . . . . . 72
Лёкса ў люксе . . . . . . . . . . 73
Што такое секса тое . . . . . . . . . . 76
Усё ясна… *(З Паўла Глазавога)* . . . . . . . . . . 78
Стратэгія . . . . . . . . . . 79
Пастараўся… . . . . . . . . . . 81
Чуб . . . . . . . . . . 82


## ВОСЫ ЛЯ ПІЎЛАРКА, альбо Ў ІНТЭРНЭЦЕ ЁСЦЬ УСЁ…


Маналог пеўня ў год Пеўня . . . . . . . . . . 86
Валюта душы . . . . . . . . . . 88
Разборкі . . . . . . . . . . 90
Восы ля піўларка . . . . . . . . . . 92
Певень на балконе . . . . . . . . . . 94

Бартар . . . 96
Баран у аптэцы (*З Андрэя Дынніка*) . . . 98
Бі свайго… . . . 99
«Палюднела ў нашым доме…» . . . 101
Навука ад унука . . . 102
Бабрыны клопат . . . 104
У інтэрнэце ёсць усё… . . . 106
Саломка . . . 109
Бізнесменка . . . 111
Зайздрасць . . . 112
Гусінае пяро . . . 113
Малакасос . . . 115
Кішэнныя расходы . . . 117
Прысягнуў жонцы . . . 118
Ода вадзе . . . 120
«Хочацца малому пасталець…» . . . 122

## КАРАЦЕЛЬКІ З «ПАРНАСКАЙ АРЦЕЛЬКІ»

«Хто часцей смяецца, той…» . . . 131

Пра аўтара . . . 139